О посещаемости музея людьми разного возраста и социального положения свидетельствуют данные к 22 августа 1922 г.: музей посетило более трех тысяч человек. Следует не забывать, что для Гомеля, население которого пережило революцию, тиф, голод, разруху, стрекопытовский погром и угрозу надвигающихся фронтов гражданской и советско-польской войн, это был показатель потребности людей в восприятии и изучении живой истории и культурного наследия своего отечества.

Таким образом, на основании архивных документов можно прояснить, как выглядела работа художественно-исторического музея им. А. В. Луначарского в Гомеле в первые годы утверждения советской власти.

Список используемых источников:

1. Государственный архив Гомельской области (ГАГО). Фонд 60. Оп. 1. Д. 95. Протоколы заседания коллегии фотокиносекции и доклад о деятельности 24 января – 26 октября 1921 г.

2. ГАГО. Фонд 60. Оп. 1. Д. 975. Доклад о деятельности Губпрофобра; списки сотрудников музея имени А. В. Луначарского и преподавателей музыкальной школы. Начато 23 января 1921 г. Окончено в мае 1921 г.

3. ГАГО. Фонд 60. Оп. 1. Д. 1304. Дело областного художественно-исторического музея имени А. В. Луначарского; акты передачи вещей из дворца Паскевича в музей и выписки из протоколов Гомельского Губисполкома. Начато 21 ноября 1921 г. Окончено 3 августа 1922 г.

УДК 94(476.5) “1874/1924”

# ПРАБЛЕМА ЛАКАЛІЗАЦЫІ ПРАДСТАЎНІКОЎ МЯШЧАНСКАГА САСЛОЎЯ З ЛІКУ НЕГАРАДСКОГА НАСЕЛЬНІЦТВА Ў 1874–1924 гг. (ПАВОДЛЕ МАТЭРЫЯЛАЎ ФОНДУ НГАБ «ВІЦЕБСКАЯ ГАРАДСКАЯ УПРАВА»)

**Урублеўскі Вадзім Валер’евіч, кандыдат гістарычных навук,**
**дацэнт, загадчык аддзела даследавання рукапісаў Цэнтра даследаванняў старадрукаў і рукапісаў**
**Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі,**
**г. Мінск, Рэспубліка Беларусь**

Ключавыя словы: мяшчане, мяшчанская управа, пасямейныя спісы, Віцебскі павет, Віцебская губернія.

Рэферат. Традыцыйна мяшчанамі лічацца прадстаўнікі гарадского насельніцтва, занятыя ў гандлі, прамысловасці, сферы абслугоўвання. Сацыяльныя працэсы першай паловы XIX ст. паўплывалі на фарміравання катэгорыі мяшчан, якія не

належылі да гарадскога насельніцва. На падставе дадзенага артыкула высвятляецца кола крыніц, якія дазваляюць лакалізаваць віцебскіх мяшчан, адзначаных у пасямейных спісах, але пры гэтым не пражываючых у межах гарадской рысы.

Сацыяльная гісторыя блізка знітаваная з дэмаграфіяй, эканомікай, рухам насельніцтва, рэгіянальнымі асаблівасцямі. У мэтах даследавання сацыяльных працэсаў і з'яў лагічна прыцягваць не толькі агульнастатыстычныя матэрыялы, але і канкрэтныя крыніцы інфармацыі са звесткамі па асабістым складзе, якія адначасова з'яўляюцца крыніцай па біяграфістыцы, генеалогіі, прасапаграфіі і інш.

Дастаткова каларытнай з'явай у сацыяльнай гісторыі Беларусі XIX стагоддзя з'яўляецца фарміраванне ў 1831–1880-я гг. цэлага пласта насельніцтва, якое набывала статус мяшчан, але пры гэтым працягвала пражываць па-за рысай гарадоў [2]. Гэта стала магчыма ў сувязі з правядзеннем т. зв. «разбору шляхты», а таксама з вызваленнем часткі сялянства з-пад прыгоннай залежнасці яшчэ да афіцыйнай адмены прыгоннага права ў 1861 г. [22, с. 263–265].

Найбольшае ўліванне насельніцтва ў сацыяльную катэгорыю мяшчанства прыходзіцца на 1860-я гг. Шляхта, якая не давяла правы прыналежнасці да дваранскага стану, асабліва пасля паўстання 1863–1864 гг. апынулася перад сацыяльным выбарам на карысць мяшчанскага або сялянскага саслоўяў.

Прыпіска да мяшчан адбывалася ў мяшчанскіх управах і гарантавала больш выгодны сацыяльны статус. Але ў той час як сяляне, якія без зямлі пакідалі вёску пасля рэформы 19 лютага 1861 г., не толькі прыпісваліся да мяшчан, але і па-сапраўднаму заставаліся ў гарадах, былая шляхта і вольныя людзі не спяшаліся адрывацца ад зямлі, з уласніцкім або арэндным тыпам яе выкарыстання.

Крыніцай уліку мяшчанскага насельніцтва ў парэформенны перыяд з'яўляліся пасямейныя спісы, якія могуць лічыцца пераемнікамі рэвізскіх сказак. У параўнанні з асноўнымі рэвізскімі сказкамі, чыё складанне залежыла ад вектараў палітыкі і асаблівасцяў сацыяльна-эканамічнага жыцця Расійскай імперыі, пасямейныя спісы заводзіліся пры мяшчанскіх управах стабільна раз на 10 год (1874, 1883, 1894, 1904, 1914 гг.).

Асноўнай мэтай складання з'яўляўся ўлік ваеннаабавязанага насельніцтва, на якое затым пры прызыве складаліся прызыўныя спісы. У адрозненні ад асноўных рэвізскіх сказак, якія ўяўлялі сабой фармуляры для запаўнення, фіксавалі змены на месцы ў канкрэтны момант, а затым перадаваліся ў казённую палату для аб'яднання ў адпаведнасці са зместам ў агульную кнігу, фармуляры з пасямейнымі спісамі маглі дапаўняцца звесткамі на месцы свайго непасрэднага складання на працягу аднаго і больш дзесяцігоддзяў. Так, на падставе прадастаўленых управе метрычных выпісаў у іх пазначаліся канкрэтныя даты нараджэння, смерці, шлюбу для мужчынскай паловы сям'і. Улічваючы агульны невысокі ўзровень захаванасці канфесійных генеалагічных матэрыялаў канца XIX – пачатку XX стст. па тэрыторыі Беларусі роля адпаведнай свецкай уліковай дакументацыі заўважна ўзрастае.

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі маюцца на захаванні дастаткова

поўна прадстаўленыя комплексы пасямейных спісаў са справаводства Мінскай мяшчанскай управы (ф. 330) і Віцебскай гарадской управы (ф. 2496)[1]. У межах Нацыянальнага архіўнага фонду гэта самыя буйныя зборы падобнага віду крыніц. Так, у фондзе Мінскай мяшчанскай управы на 2016 г. улічана і індэксавана 40 адзінак захавання за 1867–1902 гг., у фондзе Віцебскай гарадской управы на 2019 г. улічана і індэксавана 87 адзінак захавання з пасямейнымі спісамі за 1833–1918 гг. У першым і другім выпадках гаворка тычыцца мінскіх і віцебскіх мяшчан адпаведна.

Пасямейныя спісы мяшчанскіх упраў уяўляюць сабой крыніцы з наступным колам статыстычных і генеалагічных звестак: 1) № па парадку; 2) № па рэвізіі 1858 г.; 3) прозвішча, імя, імя па бацьку гаспадара і ўсіх яго сваякоў мужчынскага полу; 4) узрост па рэвізіі на час складання спіса і дата нараджэння па метрыцы для іх жа; 5) адзнака аб прыбыцці (выбыцці) мужчын пасля складання спіса (сюды запісваліся звесткі аб памерлых, нованароджаных і ўзяўшых шлюб па прадстаўленні выпісаў з метрычных кніг); 6) адзнака аб асобах, што прызываліся за апошнія 6 гадоў да складання спіса ці падлягаюць прызыву і ў якім годзе; 7) імя і імя па бацьку ўсіх сваякоў жаночага полу і іх узрост на час складання спіса; 8) адзнака аб прыбыцці (выбыцці) жанчын пасля складання спіса, у тым ліку аб узяўшых шлюб [19, с. 23–24]. Крыніцазнаўчая вартасць дадзенай крыніцы адзначана ў даследаванні гісторыка-генеалога С. А. Рыбчонка [20].

Але ў той час, як справаводчая практыка Мінскай мяшчанскай управы прадугледжвала пазначэнне месца пражывання мяшчан на момант складання пасямейных спісаў, тэндэнцыі аналагічнай працы ў Віцебску былі іншыя. Мы зрэдку знаходзім інфармацыю аб месцы пражывання сям'і. Аднак у некаторых выпадках адзначаем звесткі, якія тычацца папярэдняй прыпіскі і тэрытарыяльнага паходжання перад залічэннем у віцебскія мяшчане. Напрыклад, 31 жніўня 1879 г. у віцебскія мяшчане былі залічаны Якуб і Ян Сасаноўскія, крастоўскія мяшчане Дынабургскага павета [6].

Акрэсленая сітуацыя з віцебскімі мяшчанамі стварае значную пошукавую перашкоду, якую можна вызначыць як праблема лакалізацыі прадстаўнікоў мяшчанскага саслоўя з ліку негарадскога насельніцтва. Сітуацыя ўскладняецца адсутнасцю на дзяржаўным захаванні значнай колькасці крыніц канфесійнага характару па тэрыторыі ўсходняй Віцебшчыны за другую палову XIX – пачатак XX стст. У дадзеным даследаванні мы плануем асвятліць кола альтэрнатыўных крыніц, якія змяшчаюць інфармацыю аб геаграфічнай лакалізацыі або перасяленчым руху канкрэтных сем'яў і груп насельніцтва.

Храналагічны ахоп даследавання акрэсліваецца намі наступным дыяпазонам: 1874 (год пачатку складання пасямейных спісаў пры саслоўных органах кіравання) – 1924 гг. (год правядзення асноўнай працы над складаннем спісаў

[1]Віцебская гарадская управа не займалася складаннем і вядзеннем пасямейных спісаў на віцебскіх мяшчан. Да яе кампетэнцыі, як і іншых гарадскіх упраў, адносілася вядзенне спісаў прызыўнікоў [1, с. 162]. Пасямейныя спісы складаліся пры мяшчанскай управе. Пры фарміраванні фонду НГАБ № 2496 гэтае размежаванне абавязкаў не было ўлічана. – Аўт..

гаспадарак БССР). Менавіта гэты перыяд звычайна выклікае найбольшую складанасць у даследчыка ў пытанні высвятлення месцаў пражывання і прычын перасоўвання сем'яў. У гэтым сэнсе магчыма згадаць такія міграцыйныя хвалі як: 1) перасяленні з вёсак у гарады, перасяленні з малазямельных і перанаселеных тэрыторый у рэгёны з актыўным прамысловым развіццём; 2) змена жыхарства па прычыне змены месца арэнды ці куплі зямлі ў іншай мясцовасці; 3) прымусовыя высяленні арандатараў з месцаў пражывання ў канцы XIX – пачатку XX стст.; 4) эвакуацыя і бежанства перыяду Першай сусветнай вайны; 5) нацыяналізацыя памешчыцкіх земляў і стварэнне новых тыпаў населеных пунктаў (пасёлкаў, арцеляў і інш.) у пачатку 1920-х гг.

Такім чынам, пытанне лакалізацыі віцебскіх мяшчан паўстае па прычыне адсутнасці звестак аб месцы іх пражывання ў пасямейных спісах. Перш за ўсё, для яго вырашэння належна падключыць апублікаваныя крыніцы са звесткамі масавага парадку. Адной з такіх крыніц з'яўляецца выданне Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта «Землевладение и землевладельцы Витебской губернии в 1905 году». У дадзенай крыніцы звесткі біяграфічнага і генеалагічнага парадкаў прадстаўлены ў таблічнай форме па паветах і саслоўях. Змяшчаюць наступныя пазіцыі: 1) нумар па парадку; 2) прозвішча, імя, імя па бацьку землеўладальніка; 3) веравызнанне; 4) назва маёнтка; 5) назва валасці, у якой знаходзіцца маёнтак; 6) агульная колькасць валодаемай зямлі ў дзесяцінах (прыдатнай, непрыдатнай, занятай лесам, усяго); 7) адрас землеўладальніка або маёнтка [3].

У адносінах да землеўладальнікаў Віцебскага павета прадстаўлены звесткі на 558 індывідуальных і калектыўных уласнікаў з ліку мяшчан (у адной пазіцыі могуць быць прыведзены даныя на некалькі родзічаў з адным прозвішчам, што супольна валодалі зямлёй, ці на супольных уласнікаў без заўважнай ступені роднасці) [3, с.16–36]. Пры гэтым неадзначана да якой канкрэтна управы прыпісаныя мяшчане, а значыць хто з іх непасрэдна належыць да віцебскіх. Узаемадапаўненне пасямейных спісаў Віцебскай мяшчанскай управы і спісаў землеўладальнікаў Віцебскага павета дае адказы на пытанні: 1) дзе пражывалі асобныя віцебскія мяшчане, якія ёсць у першай крыніцы; 2) ці адносіліся мяшчане з другой крыніцы да віцебскіх.

Так, праваслаўны Лаўрэнцій Фаміч Апенка, які пазначаны 16-гадовым у пасямейным спісе за 1882 г.[1], згадваецца як уласнік маёнтка Дзюганы Вярхоўскай валасці Віцебскага павета ў 1905 г. [3, с. 16; 11, арк. 48–49]. Каталікі Іосіф і Рафаіл Мацвеевічы Стырыковічы, якім на 1882 г. было адпаведна 32 і 25 гадоў, у 1905 г. адзначаны як саўладальнікі маёнтка Сяло Курынскай валасці Віцебскага павета [3, с. 32; 12]. У рэдкіх выпадках месца пражывання пазначалася і ў пасямейных спісах на віцебскіх мяшчан. Напрыклад, у 1882 г. старавер Васіль Макеевіч Гусакоў, 38 год, пражываў у слабадзе Падгародная Мішкаўскай валасці Віцебскага павета. На 1905 г. месцам уласнасці адзначаны ўчастак маёнтка Загараны той жа валасці. Па суседняй пазіцыі праходзіць яго сын Акім Васільевіч Гусакоў, каля 1871 г. н.,

[1]Другія ў Расійскай імперыі агульныя пасямейныя спісы пры мяшчанскіх і валасных праўленнях складаліся ў 1882 годзе да 1 студзеня 1883 г., таму яны могуць згадвацца ў літаратуры двояк. – Аўт.

адзначаны як саўладальнік маёнтка Загараны польна з Праскоўяй Мяфодзьеўнай Гусаковай) [3, с. 20; 11, арк. 570–571].

Важнай крыніцай, якая прыдатная да лакалізацыі асоб з пасямейных спісаў, таксама варта лічыць спісы выбаршчыкаў у Дзяржаўную думу IV склікання па Віцебскай губерні (выбары адбываліся ў 1912 г.). Правы атрымлівалі падданыя імперыі з належным маёмасным або гандлёвым цэнзамі. У згаданай крыніцы інфармацыя аб асобах, што мелі права ўдзелу ў выбарах, размешчана па гарадах і паветах у алфавітным парадку прозвішчаў. Пазіцыі ў дачыненні да насельніцтва паветаў акрэслены наступныя: 1) парадкавы нумар выбаршчыка; 2) прозвішча, імя, імя па бацьку, саслоўная прыналежнасць; 3) веравызанне; 4) геаграфічная назва нерухомасці (маёнтак, фальварак, ферма, участак, дом-кватэра і г. д.); 5) кошт уладання. Пазнака аб мяшчанскім стане сям'і дае падставы на пошук звестак аб сямейна-роднасных повязях асобы ў пасямейных спісах. Калі мешчанін пражываў у Віцебскім павеце, то тут найбольш запатрабаваны пасямейныя спісы віцебскіх мяшчан. Адпаведна сям'я з пасямейных спісаў трапна лакалізуецца на 1912 год, дзякуючы спісам выбаршчыкаў [21].

Так, латыш лютэранскага веравызнання Марцін Марцінавіч Звірбуль, чыя дата нараджэння пазначана ў пасямейным спісе за 1874 год як 3 верасня 1865 г., сын Марціна Звірбуля-Цырульніка (1814–1881 гг.), адзначаны ў 1912 г. як уладальнік фальварка Блюмаўка з участкам Яловая Пушча пры маёнтку Глоданкі Віцебскага павета [14; 21, арк. 78]. У 1925 г. Марцін Марцінавіч фіксуецца з прозвішчам Звірбул як жыхар вёскі Глоданкі-1 Лёзненскага раёна Віцебскай акругі [5, арк. 65 адв.].

У спісе выбаршчыкаў таксама адзначаецца віцебскі мешчанін Яўген Лях, які валодаў маёнткам Ляхі Віцебскага павета. Аднак трэба адзначыць, што ў спіс ён быў унесены праз 15 гадоў пасля сваёй фізічнай смерці 30 чэрвеня 1897 г. Гэта дазваляе рабіць выснову, што спісы выбаршчыкаў за 1912 г. не вывяраліся перад публікацыяй, а значыць могуць змяшчаць «мёртвыя душы» [9, арк. 32; 21, арк. 83]. У той жа час у спісе землеўладальнікаў за 1905 г. называюцца Якаў і Ларывон Яўгенавічы Ляхі, чым падкрэсліваецца факт смерці іх бацькі задоўга да складання спісу выбаршчыкаў [3, с. 24].

Важнай акалічнасцю пошуку і параўнання звестак з'яўляецца тое, што адсутнасць асобных блокаў інфармацыі не дазваляе да канца атаясамляць людзей з розных спісаў. Так, Вікенцій Вікенцьеў Дамарацкі, віцебскі мешчанін, 22 жніўня 1867 г. н., толькі прэтэндуе на ролю ўладальніка маёнтка Сухаршчына-Белахвосты, але адсутнасць імя па бацьку ў спісах выбаршчыкаў за 1912 г., не дае магчымасці дакладна верыфікаваць гэты факт уласнасці [8, арк. 140адв.–141; 21, арк. 77]. Пры гэтым яго бацька Вікенцій Казіміраў памёр толькі 27 снежня 1904 г., таму ў святле вышэй прыведзенага прыкладу застаецца верагоднасць, што Сухаршчына-Белахвосты належылі яму [8, арк. 139 адв.–140].

Неабходна ўлічваць выпадкі, калі віцебскія мяшчане пражывалі ў межах суседніх губерняў і па факце тэрытарыяльнай прыналежнасці траплялі ў разнастайныя генеалагічныя крыніцы іх паветаў.

У сувязі з гэтым звернемся да прызыўных спісаў па віцебскіх мяшчанах, якія таксама захоўваюцца ў фондзе Віцебскай гарадской управы. У прызыўных спісах падавалася наступная інфармацыя: 1) № па парадку; 2) № па рэвізіі 1858 г.; 3) прозвішча, імя, імя па бацьку прызыўніка; 4) саслоўе і месца прыпіскі (таксама месца жыхарства, у выпадку калі яны не супадаюць); 5) дата нараджэння па метрыцы; 6) узрост па рэвізіі; 7) узрост па прыпісным пасведчанні; 8) склад сям'і з пазначэннем ступені роднасці і ўзросту (як правіла, звесткі падаваліся толькі на мужчын, або зусім не падаваліся); 9) дадатковыя звесткі аб прызыўніку (веравызнанне, сямейны стан, адукацыя і пісьменнасць, род заняткаў, фізічныя дадзеныя, а таксама адзнакі аб прыняцці на службу, вызваленні ад службы, залічэнні ў апалчэнне і інш.) [19, с. 23–24; 20].

Так, з прызыўных спісаў мы дазнаемся, што старавер Арцемій Тарасавіч Фадзееў прызываўся ў 1896 г., з'яўляўся віцебскім мешчанінам паводле прыпіскі і жыхаром вёскі Засор'е Астроўненскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні паводле факта жыхарства [15, арк. 62 адв.–63]. Паводле пасямейнага спісу год нараджэння прыходзіцца на 1875 г., што адпавядае факту прызыва ў 21-гадовым узросце [10, арк. 122 адв.–123]. Згаданага Арцемія мы знаходзім таксама ў спісах гаспадарак Віцебскага раёна за 1925 г., па суседстве са старэйшым братам Афанасіем Фадзеевым [4, арк.75].

Віцебская мяшчанка Разалія Антонаўна Кошка, каталічка, адзначаная ў пасямейным спісе за 1874 год як 30-гадовая, згадваецца ў спісе землеўладальнікаў па Магілёўскай губерні за 1884 г. як спадчынная саўладальніца маёнткаў Ляхавічы і Малыя Таронкавічы Сенненскага павета [7; 18, с. 206–207]. У спісе землеўладальнікаў па Магілёўскай губерні інфармацыя засяроджана ў наступных пазіцыях: 1) парадкавы нумар; 2) прозвішча, імя, імя па бацьку, званне і веравызнанне землеўладальніка; 3) назва маёнтку; 4) колькасць зямлі ў дзесяцінах (асобна пад лесам, ворывам, сенажаццю); 5) права валодання і з якога часу; 6) хто займаецца гаспадаркай, падатковыя артыкулы ў маёнтку і іх гадавы прыбытак.

Улічваючы масавы характар набыцця зямлі ў канцы XIX – пачатку XX стст., інтарэс набываюць матэрыялы самага значнага збору, датычнага дзейнасці ў беларускіх губернях Сялянскага Пазямельнага банку, – яго віцебскага аддзялення (ф. 2510). Фонд уключае 11 тысяч 82 адзінкі захавання. Так, віцебскі мешчанін Андрэй Іванавіч Лац, 26.12.1838 г. н., адзначаны ў пасямейным спісе 1874 г., у 1903 г. прадаваў зямлю ў маёнтку Вялікія Храпавічы Храпавіцкай воласці Віцебскага павета [9, арк. 93 адв.–94; 16]. У 1911 г. яўрэю Аўраму Ізраілевічу Пукшанскаму непасрэдна Пазямельны банк аддаў у доўгатэрміновую арэнду 270 сажняў у Іллінскай воласці Веліжскага павета Віцебскай губерні [17]. Абрам-Ерухім Пукшанскі, 23.01.1866 г. н., згаданы ў пасямейным спісе па віцебскіх мяшчанах за 1883 г., але ў дадзенай справе называецца ўжо іллінскім мешчанінам [13].

Прыведзенае даследаванне сведчыць, што лакалізацыя сем'яў жыхароў Беларусі, прыпісаных да мяшчан, але без тэрытарыяльнай прывязкі ў сваіх пасямейных спісах, цалкам магчыма. Шырокі комплекс крыніц, якімі з'яўляюцца спісы землеўладальнікаў, спісы выбаршчыкаў у Дзяржаўную думу, прызыўныя спісы перыяду Расійскай

імперыі, спісы крэдытораў з фондаў аддзяленняў Сялянскага Пазямельнага банка, спісы сялянскіх гаспадарак перыяду БССР, дазваляе дакладна лакалізаваць або звузіць маштаб пошуку да канкрэтнай мясцовасці. Дадатковы інтарэс прадстаўляюць крыніцы архіўных устаноў іншых краін, напрыклад, Расійскага ваенна-гістарычнага архіва, дзе змяшчаюцца карткі на ваеннаслужачых імперскай арміі, якія загінулі, прапалі бяз вестак, траплялі ў шпіталі па хваробе, раненні ці кантузіі. Дадзеныя карткі таксама нярэдка змяшчаюць звесткі аб месцы нараджэння ці пражывання вайскоўца. Таксама варты ўвагі буйны фонд Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва пад назвай «Сялянскі пазямельны банк» (ф. 592), дзе змяшчаюцца справы аб атрыманні крэдытаў на куплю зямлі, у т. л. па беларускіх тэрыторыях.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Витебская губерния : государственные, религиозные и общественные учреждения (1802 – 1917 гг.) / Т. Е. Леонтьева [и др.]. – Минск : БелНИИДАД, 2009. – 524 с.

2. Вяроўкін-Шэлюта, У. Разбор шляхты / Уладзіслаў Вяроўкін-Шэлюта // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Том 6. – Кн. 1. – Мінск, 2001. – С. 83–85.

3. Землевладение и землевладельцы Витебской губернии в 1905 году / издание Витебского губернского статистического комитета; под ред. Члена-секретаря губернского статист. Комитета А. Сапунова. – Витебск : Вит. Губ. Типо-Лит., 1907. – 612 с.

4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 30. – Воп. 2. – Спр. 1456. – Спіс гаспадарак Віцебскага р-на Віцебскай акругі, 1925 г.

5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 30. – Воп. 2. – Спр. 1461. – Спіс гаспадарак Лёзненскага р-на Віцебскай акругі, 1925 г.

6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2496. – Воп. 1. – Спр. 2489. – Арк. 91 адв.–92. – Пасямейныя спісы віцебскіх мяшчан Сасаноўскіх і Лушкіна, 1874 г.

7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2496. – Воп. 1. – Спр. 2493. – Арк. 345 адв.–346. – Пасямейны спіс віцебскай мяшчанкі Разаліі Кошкі, 1874 г.

8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2496. – Воп. 1. – Спр. 2511. – Арк. 139 адв.–141. – Пасямейныя спісы віцебскіх мяшчан Дамарацкіх, 1874 г.

9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2496. – Воп. 1. – Спр. 2516. – Арк. 32, 93 адв.–94. – Пасямейныя спісы віцебскіх мяшчан Ляхаў і Лацаў, 1874 г.

10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2496. – Воп. 1. – Спр. 2517. – Арк. 122 адв.–123. – Пасямейныя спісы віцебскіх мяшчан Фадзеевых, 1874 г.

11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2496. – Воп. 1. – Спр. 2609. – Арк. 48–49, 570–571. – Пасямейныя спісы віцебскіх мяшчан Апенкаў і Гусаковых, 1882 г.

12. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2496. – Воп. 1. – Спр. 2611. – Арк. 274–275. – Пасямейныя спісы віцебскіх мяшчан Стырыковічаў, 1882 г.

13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2496. – Воп. 1. – Спр. 2617. – Арк. 326 адв.–327. – Пасямейныя спісы віцебскіх мяшчан Пукшанскіх, 1883 г.

14. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2496. – Воп. 1. – Спр. 2618. – Арк. 403 адв.–404. – Пасямейныя спісы віцебскіх мяшчан Звірбуляў, 1874 г.

15. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2496. – Воп. 1. – Спр. 2733. – Прызыўныя спісы віцебскіх мяшчан, 1896 г.

16. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2510. – Воп. 1. – Спр. 2356. – Справа аб дазволе Хмараўскаму таварыству гаспадароў на атрыманне крэдыту для куплі 30 дзесяцін зямлі віцебскага мешчаніна Андрэя Іванавіча Лаца ў маёнтку Вялікія Храпавічы Храпавіцкай воласці Віцебскага павета, 17.02.1903 – 17.03.1914 гг.

17. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2510. – Воп. 1. – Спр. 6025. – Справа аб здачы Пазямельным банкам у доўгатэрміновую арэнду Аўраму-Ерухіму Ізраілевічу Пукшанскаму, іллінскаму мешчаніну з мястэчка Ілліно, 270 сажняў зямлі ў Іллінскай воласці Веліжскага павета Віцебскай губерні, 12.03.1911–02.01.1917 гг.

18. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях / сост. [с предисл.] и под ред. А. С. Дембовецкого. – Могилев, 1882–1884. – Т. 3.

19. Рыбчонак, С. А. Крыніцы массавага паходжання па генеалогіі Беларусі сярэдзіны XVII – пачатку XX ст. / С. А.Рыбчонак. – Мінск, 2010. – 25 с.

20. Рыбчонак, С. А. Прызыўныя і пасямейныя спісы апошняй чвэрці XIX – пачатку XX ст. як крыніца па генеалогіі Беларусі: спецыфіка інтэрпрэтацыі, ацэнка верагоднасці звестак і ступень захаванасці // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 8. / Рэдкалегія: Э. М. Савіцкі (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелНДІДАС, 2008. – С. 146–154.

21. Список лиц, имеющих право участия в выборах в Государственную Думу на первом съезде городских избирателей по гор. Витебск и уездам Витебской губернии. – Витебск, 1912. – 415 с.

22. Улашчык, М. Выбранае / М. Улашчык; Уклад. А. Каўкі і А. Улашчыка. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2001. – 608 с.